**Каханоўскі Аляксандр Генадзьевіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# САЦЫЯЛЬНЫЯ ПЕРАДУМОВЫ СТАНАЎЛЕННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

Пачатак XX ст. вызначыўся актыўнымі працэсамі нацыянальна-культурнага самавызначэння народаў і іх дзяржаўнага будаўніцтва, якія непасрэдна закранулі заходнія ўскраіны Расійскай імперыі. У асэнсаванні гэтых працэсаў, вызначэнні іх прычын важнае месца належыць разгляду сацыяльных передумоў, фактычна апасродкаванаму адказу на пытанне, наколькі было падрыхтавана грамадства і яго эліты да стварэння ўласнай дзяржаўнасці.

Расійская палітыка русіфікацыі, выразна афармленая пасля паўстання 1863 г., значна запаволіла беларускую культурна-асветніцкую дзейнасць, фарміраванне палітычных сіл і арганізацый. Аднак у гэты ж перыяд набыла свае абрысы ідэя беларускай нацыі. Пашырэнне беларускай па сваім сённяшнім змесце свядомасці звязана з дзейнасцю мясцовай народніцкай, а затым марксісцкай моладзі. Яна не прымала ранейшую «ліцвінскую», «краёвую» ідэалогію, звязаную са шляхецтвам, а больш арыентавалася на сялянства. Беларускі этнас прайшоў складаны шлях да станаўлення нацыі сучаснага тыпу. Супярэчлівасць гэтага шляху, ваганне працэсаў развіцця этнічнай свядомасці і нацыянальнай культуры абцяжарвала вызначэнне інтэлігенцыяй свайго месца, гістарычных абрысаў нацыянальнай ідэі і ўвогуле самавызначэнне беларускай нацыі. Аб’ектыўна працэс яе фарміравання ў XIX – пачатку XX ст. вызначаўся асаблівасцямі і характарам мадэрнізацыі, запаволенасцю працэсу мабілізацыі сацыяльнай структуры грамадства, кірункам і вынікамі палітыкі расійскага ўрада ў Беларусі, традыцыйнымі рысамі нацыянальна-культурнага развіцця, недастатковымі тэмпамі пашырэння пісьменнасці.

Адукацыя выступала адным з асноўных інструментаў этнакультурнай уніфікацыі. Для Расійскай імперыі была характэрнай дзяржаўная манаполія на адукацыйную дзейнасць. Улада мела вызначальную ролю пры фарміраванні зместу школьнай асветы. У «Запісцы аб некаторых пытаннях па ўладкаванні Паўночна-Заходняга краю», пададзенай 14 мая 1864 г. віленскім генерал-губернатарам М. Мураўёвым імператару Аляксандру II, асобая ўвага надавалася развіццю адукацыі як сродку рэалізацыі ўрадавай палітыкі [2, с. 42]. У пачатку 60-х гг. XIX ст. папячыцелем Віленскай навучальнай акругі А. Шырынскім-Шыхматавым былі акрэслены прынцыпы арганізацыі пачатковай адукацыі на тэрыторыі Беларусі. Перш за ўсё, гэта адміністрацыйны кантроль і рускамоўнае навучанне. Акрамя таго, перад школай была пастаўлена палітычная задача – садзейнічаць умацаванню «рускіх пачаткаў» у беларускіх губернях [1, с. 118–119]. Школа ў другой палове XIX – пачатку XX ст. становіцца месцам змагання польскіх і расійскіх уплываў за свядомасць і настроі беларускага сялянства.

Паводле даных перапісу насельніцтва 1897 г. у беларускіх губернях налічвалася 76 934 чалавек, якія мелі адукацыю вышэй пачатковай, што складала 4,1 % ад колькасці мясцовага пісьменнага насельніцтва. У іх ліку былі 18 173 асобы з адукацыяй вышэй пачатковай (23,6 %), якія прызнавалі

сваёй роднай мовай беларускую, 33 681 (43,8 %) чалавек з роднай мовай рускай, 14 875 (19,3 %) – з польскай, 5280 (6,9 %) – з яўрэйскай [3, с. 76–77; 4, с. 116–117; 5, с. 146–147; 6, с. 112–113; 7, с. 132–133]. Сярод пісьменных беларусаў на тэрыторыі пяці губерняў удзельная вага асоб з адукацыяй вышэй пачатковай была параўнальна невысокай (2,3 %), ніжэй, з улічаных этнічных супольнасцей, – толькі ў яўрэяў (1,0 %). Максімальнай удзельная вага асоб з адукацыяй вышэй пачатковай сярод пісьменных беларусаў была ў Віленскай губерні (4,8 %), мінімальнай – у Гродзенскай (1,1 %) [3, с. 76–77; 4, с. 116–117; 5, с. 146–147; 6, с. 112–113; 7, с. 132–133]. Найбольшай сярод разгледжаных этнічных супольнасцей удзельная вага асоб з адукацыяй вышэй пачатковай была сярод пісьменных рускіх. Тлумачыцца гэта тым, што чыноўніцкі корпус, кантынгент занятых у сферах, якія патрабавалі прафесійнай падрыхтоўкі, фарміраваліся пераважна за кошт выхадцаў з іншых рэгіёнаў Расійскай імперыі, найперш цэнтральных губерняў, а таксама тым, што ўраджэнцы Беларусі, атрымаўшы адукацыю, «выбіўшыся ў людзі», нярэдка імкнуліся атаясамліваць сябе з рускай культурай і мовай. Па беларускіх губернях дыферэнцыяцыя колькасных значэнняў удзельнай вагі асоб з адукацыяй вышэй пачатковай сярод пісьменных рускіх была дастаткова высокай: найменшае ў Віцебскай губерні – 16,8 %, максімальнае – у Віленскай (32,8 %). Сярод пісьменных палякаў працэнт асоб з адукацыяй вышэй пачатковай складаў па беларускіх губернях 8,5 %. Больш іх было ў Магілёўскай губерні (19 %), найменш – у Гродзенскай (4,6 %). Блізкімі працэнтнымі суадносінамі характарызавалася па губернях велічыня ўдзельнай вагі асоб з адукацыяй вышэй пачатковай сярод пісьменнага яўрэйскага насельніцтва. Найбольшай іх удзельная вага была ў Віленскай губерні (1,4 %), мінімальнай – у Гродзенскай і Мінскай (па 0,8 %) [3, с. 76–77; 4, с. 116–117; 5, с. 146–147; 6, с. 112–113; 7, с. 132–133].

Суб’ектам сацыяльна-культурных змен у грамадстве выступіла інтэлігенцыя. За бачнымі праявамі яе фарміравання хаваліся тэндэнцыі і супярэчнасці гэтых змен. Іх парцыяльны, залежны ад урадавых мерапрыемстваў характар вызначыў складанасць і супярэчлівасць шляху станаўлення самой інтэлігенцыі. Фарміраванне складу гэтай групы знаходзілася ў непасрэднай залежнасці ад узроўню і запатрабаванасці яе сацыяльных функцый. Яна прайшла складаны шлях уласнага станаўлення, акрэслення меж як сацыяльнай групы і выконваемых задач.

Расійская ўрадавая палітыка непасрэдна ўплывала на фарміраванне і склад інтэлігенцыі як сацыяльна-прафесійнай групы праз вызначэнне прыярытэтаў сацыяльнай і культурна-асветніцкай дзейнасці, стварэнне адпаведных дзяржаўных устаноў, устанаўленне правіл выяўлення прыватнай ініцыятывы, патрабаванняў да магчымасці займаць пасады і грашовага ўтрымання. Прадстаўнікам інтэлектуальных прафесій ў дзяржаўных праектах адводзілася значнае месца ў рэалізацыі сацыяльна-камунікатыўных функцый у грамадстве.

Інтэлектуальнае жыццё Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. знаходзілася пад пераважным уплывам рускай культуры. Акрамя ўрадавых мерапрыемстваў, гэтаму садзейнічалі змены ў польскім грамадстве, у якім атрымала папулярнасць імкненне да эканамічнага росквіту Польшчы. Барацьба за нацыянальнае вызваленне адкладвалася на аддаленую перспектыву. Значная частка творчай эліты, інтэлігенцыі Беларусі трапіла

пад уздзеянне ідэй «заходнерусізму», які на самым пачатку свайго фарміравання як ідэалагічнай плыні меў пэўную ліберальна-дэмакратычную афарбоўку, што было звязана са спробай з боку рускамоўнага культурнага асяродка даказаць непольскасць беларусаў і тым самым аб'ектыўна садзейнічаць вырашэнню пытання аб іх этнічным самавызначэнні. Глыбокія якасныя змены ў фарміраванні інтэлігенцыі адбыліся ў час і пасля рэвалюцыі 1905–1907 гг. З пашырэннем легальнага друку, у тым ліку з'яўленнем беларускамоўнага, распаўсюджваннем прафесійных, грамадска-культурных аб'яднанняў і гурткоў, заснаваннем выдавецкіх суполак, нацыянальных тэатральных калектываў узраслі новыя формы і кірункі інтэлектуальнага жыцця. На гэтым этапе больш акрэсленымі становяцца розныя этнічныя групы інтэлігенцыі, вылучаецца беларуская нацыянальная яе частка. Апошняй, аднак, не ўдалося атрымаць дастатковы ўзровень сацыяльнай сталасці для рэалізацыі ў поўнай меры сваіх дзяржаўна-палітычных і культурна-асветніцкіх ідэалаў.

Паводле даных перапісу 1897 г., у беларускіх губернях налічвалася 19530 чалавек, якія займаліся вучэбнай і выхаваўчай дзейнасцю, 6909 асоб, занятых урачэбнай і санітарнай дзейнасцю, 1589 – навукай, літаратурай і мастацтвам, 883 – прыватнай юрыдычнай дзейнасцю, 241 – службай у дабрачынных установах [3, с. 106; 4, с. 164; 5, с. 194; 6, с. 152; 7, с. 172]. Тут улічаны толькі асобы, якія мелі самастойныя заняткі. Сярод тых, хто займаўся вучэбнай і выхаваўчай дзейнасцю, 55,6 % складалі яўрэі, 18,4 % – беларусы, 16,4 % – рускія, 5,1 % – палякі і інш. [3, с. 106, 110, 111, 113; 4, с. 164, 172, 174; 5, с. 194, 202, 203, 205; 6, с. 152, 158, 161; 7, с. 172, 178, 179, 182]. Удзельная вага беларусаў, якія займаліся вучэбнай і выхаваўчай дзейнасцю, была некалькі вышэй, чым, напрыклад, літоўцаў сярод адпаведнай групы у Літве (15,5 %), і ніжэй, чым ва ўкраінцаў (22,5 %) [8, с. 120]. У ліку асоб, занятых урачэбнай і санітарнай дзейнасцю, 20,2 % было беларусаў, 25,7 – рускіх, 17,6 – палякаў, 29,8 % – яўрэяў [3, с. 106, 110, 111, 113; 4, с. 164, 172, 174; 5, с. 194, 202, 203, 205; 6, с. 152, 158, 161; 7, с. 172, 178, 179, 182]. Беларусы складалі 7,2 % сярод занятых навукай, літаратурай і мастацтвам у беларускіх губернях [3, с. 106, 110, 111, 113; 4, с. 164, 172, 174; 5, с. 194, 202, 203, 205; 6, с. 152, 158, 161; 7, с. 172, 178, 179, 182]. Акрамя таго, 25,7 % занятых навукай, літаратурай і мастацтвам у беларускіх губернях складалі рускія, 18,0 % – палякі, 40,7 % – яўрэі. Сярод тых, хто меў тут прыватную юрыдычную практыку, 8,5 % былі беларусамі, 30,7 % – рускімі, 23,8 % – палякамі, 33,4 % – яўрэямі [3, с. 106, 110, 111, 113; 4, с. 164, 172, 174; 5, с. 194, 202, 203, 205; 6, с. 152, 158, 161; 7, с. 172, 178, 179, 182]. Сярод невялікай групы асоб, занятых працай у дабрачынных установах, 19,9 % былі беларусамі, 28,2 % – рускімі, 20,7 % – палякамі, 23,7 % – яўрэямі [3, с. 106, 110, 111, 113; 4, с. 164, 172, 174; 5, с. 194, 202, 203, 205; 6, с. 152, 158, 161; 7, с. 172, 178, 179, 182].

На фарміраванне інтэлігенцыі Беларусі адчувальны ўплыў аказала схільнасць яе да ўдзелу ў нацыянальна-палітычных працэсах, а ў апошняй трэці XIX – пачатку XX ст. імкненне таксама да вырашэння сацыяльных пытанняў. Гэта вызначыла апазіцыйнасць значнай часткі інтэлігенцыі да існаваўшага дзяржаўнага ладу і стала прычынай выяўлення адной з асноўных спецыфічных рыс яе фарміравання, звязанай са стратай пераемнасці паміж рознымі пакаленнямі гэтай групы. Аднак колькасныя

паказчыкі фарміравання інтэлігенцыі нярэдка непасрэдна залежалі ад рэалізацыі ўрадавых мерапрыемстваў. Больш таго, пры вызначэнні прыярытэтаў развіцця сацыяльна-культурнай сферы грамадства, адпаведна і інтэлігенцыі, урадам акцэнтаваліся задачы ўмацавання рускіх дзяржаўна-палітычных асноў насуперак польскім уплывам. Інтэлігенцыя Беларусі вызначалася шматнацыянальным і шматмоўным складам, прычым беларуская нацыянальная яе частка складала меншасць, для якой на радзіме былі абмежаваныя магчымасці сацыяльнага росту.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Ершова, О.И. Разработка принципов организации начального народного образования в Виленском учебном округе в начале 60-х гг. XIX в. / О.И. Ершова // Российские и славянские исследования : сб. науч. ст. / Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2004. – Вып. 1. – С. 118–122.
2. Из бумаг графа М.Н. Муравьева / с предисл. графа С.Д. Шереметьева. – СПб. : Тип. М. Стасюлевича, 1898. – 49 с.
3. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. – [Вып.] 4 : Виленская губерния. Тетрадь 3 (последняя). – XI, 179 с.
4. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. – [Вып.] 5 : Витебская губерния. Тетрадь 3. – XIV, 281 с.
5. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. – [Вып.] 11 : Гродненская губерния. – XV, 319 с.
6. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1904. – [Вып.] 22 : Минская губерния. – XVI, 243 с.
7. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. / под ред. Н.А. Тройницкого. – СПб. : Изд. Центр. стат. ком. М-ва внутр. дел, 1903. – [Вып.] 23 : Могилевская губерния. – XV, 275 с.
8. Терешкович, П.В. Этническая история Беларуси XIX – начала XX в.: в контексте Центрально-Восточной Европы / П.В. Терешкович. – Минск : Белорус. гос. ун-т, 2004. – 223 с.



**Кімбар Андрэй Уладзіміравіч**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*


# ПРЫЯРЫТЭТНЫЯ КІРУНКІ ДЗЕЙНАСЦІ ЛКСМБ У 1944 – СЯРЭДЗІНЕ 1950-х гг.

У перыяд Вялікай Айчыннай вайны камсамольцы Беларусі, знаходзячыся у шэрагах Савецкай Арміі і ў тыле ворага, унеслі вялікі ўклад у здабыванне перамогі над нямецка-фашысцкім войскам. З вызваленнем тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў перад Ленінскім камуністычным саюзам моладзі Беларусі паўстаў шэраг новых задач, звязаных з пераадоленнем разбуральных наступстваў вайны.

Фактычна, першаснай задачай, якая паўстала перад кіраўніцтвам камсамола, было аднаўленне і развіццё структурных адзінак ЛКСМБ на тэрыторыі вызваленай рэспублікі. ЦК КП(б)Б Беларусі паставіў перад камсамольцамі задачу актыўна дапамагаць партыйным, савецкім і гаспадарчым органам у аднаўленні разбуранай народнай гаспадаркі, у хуткай ліквідацыі наступстваў фашысцкай акупацыі. Для паспяховага